Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Грыцкавіцкі навучальна – педагагічны комплекс
дзіцячы сад – сярэдняя школа”

# Што я ведаю пра сваіх блізкіх

Канспект гутаркі ў першай рознаўзроставай групе

Грышчанка Наталія Вікенцьеўна
вышэйшая адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

аг. Грыцкевічы, 2022

Мэта: фарміраванне ўяўленняў пра сям'ю і сваякоў; выхоўванне станоўчых ўзаемаадносін ў сям'і, пачуцця любові і павагі да членаў сваёй сям'і.

Матэрыял: сямейныя фатаграфіі дзяцей і выхавальніка.

Папярэдняя праца: развучванне пальчыкавых гульняў "Мая сям'я", "Хто жыве ў сям'і"; чытанне казак "Тры мядзведзі", "Гусі-лебедзі; дыдактычныя гульні "Чые дзеткі","Дапаможам маме".

Ход гутаркі:

Выхавальнік:

Дзеткі, паспрабуйце адгадаць загадкі і вы даведаецеся, аб чым мы сёння будзем з вамі размаўляць.

Без чаго на белым свеце
Дарослым не пражыць і дзецям?
Хто падтрымае вас, сябры?
Ваша дружная... (сям'я)

Правільна! Мы пагаворым сёння пра сям'ю.

Дзеткі, як вы думаеце, што такое сям'я?

Дзеці: Сям'я-гэта тата, мама, брат, сястрычка, дзядуля, бабуля.

Правільна, сям'я - гэта самае дарагое, што ёсць у чалавека. Усе члены сям'і любяць, паважаюць адзін аднаго, клапоцяцца адзін пра аднаго.

Вы сёння прынеслі фатаграфіі сваёй сям'і з вашага сямейнага фотаальбома. Раскажыце, хто жыве ў вашай сям'і? Але спачатку я хачу вам расказаць пра маю сям'ю, паслухайце. (Выстаўляю фатаграфію на дошку). На гэтай фатаграфіі намалявана мая сям'я. Мая маленькая сям'я. Тут мае самыя блізкія сваякі гэта. Я вельмі люблю сваю сям'ю.

А цяпер, давайце паслухаем вашы апавяданні пра сваю сям'ю.

(Жадаючыя дзеці расказваюць па фатаграфіі аб сваёй сям'і. Выхавальнік дзякуе дзеткам за цікавыя апавяданні, пры цяжкасці дапамагае навадным пытаннямі, звяртае ўвагу на тое, што на ўсіх фотаздымках члены сям'і вясёлыя, усміхаюцца, значыць любяць адзін аднаго).

Малайцы, добрыя атрымаліся апавяданні, але не ўсе дзеткі змаглі расказаць, а мне хочацца пачуць ад усіх, якая ў вас сям'я. Прапаную пагуляць у гульню, якая так і называецца "Якая ў вас сям'я?"(гульня праводзіцца з мячом).

Дзеці ўстаюць у круг, у цэнтры круга выхавальнік з мячом. Ён кідае мяч дзіцяці і пытаецца: - якая ў вас сям'я? Дзіця, злавіўшы мяч, павінен адказаць, падбіраючы прыметнік.

(Вялікая, маленькая, дружная, клапатлівая, працавітая, вясёлая, добрая, здаровая, моцная, шчаслівая)

Малайцы, бачу, выдатныя ў вас сем'і. А яшчэ мне хочацца даведацца, хто чым заняты ў вашай сям'і. Давайце пагуляем у гульню "Хто, што робіць у нашай сям'і?"(гульню праводзіцца з флажком).

Выхавальнік задае пытанне, напрыклад: - што робіць мама (тата, бабуля, дзядуля, брат, сястра?) Дзеці падбіраюць дзеяслоў (гладзіць, гатуе, мые посуд, ходзіць на працу, шые, зарабляе грошы, правярае ўрокі, ходзіць у краму за пакупкамі, вучыць урокі, даглядае кветк, выцірае пыл, гуляе, чытае, майструе ...)

Дзякуй, рабяты, я вельмі рада, што вы так шмат ведаеце аб сваёй сям’і, аб тым, хто і чым любіць займацца ў вашай сям'і. З вашых адказаў я зразумела, што ў вас ва ўсіх дружныя сем'і. Сям'я вельмі патрэбна кожнаму чалавеку, вялікаму і маленькаму.

Дзеткі, давайце кожны з вас намалюе сваю сям'ю, а ўвечары вы падаруеце свае малюнкі бацькам.

Дзеці садзяцца за сталы і пад лёгкую музыку ствараюць партрэты сваёй сям'і.